# Майстар-клас «Рук нашых цяпло»
# да Міжнароднага Дня інвалідаў

Напярэдадні Міжнароднага дня інвалідаў, у рамках рэспубліканскай акцыі «Толькі разам мы АДЗІНЫЯ!» для людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна» прайшоў майстар-клас «Рук нашых цяпло». Удзельнікамі майстар-класа былі супрацоўнікі і наведвальнікі аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў, работнікі і пажылыя валанцёры аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна».

Маладыя інваліды пры падтрымцы кіраўніка гуртка і пажылых валанцёраў рабілі паштоўкі ў тэхніцы скрапбукінг. Пагрузіцца і праявіць цікавасць да працы дапамагла пальчыкавая гімнастыка. Вынікам майстар-класа сталі выдатныя паштоўкі для блізкіх людзей.

Майстар-клас прайшоў у атмасферы эмацыянальнай цеплыні і добразычлівасці.





